10. *Shoshan, B.* Popular culture in medieval Cairo / B. Shoshan. – Cambridge: Cambridge University Press, 1993. – 168 p.

11. *Peters, R.* Crime and Punishment in Islamic Law. Theory and Practice from Sixteenth to the Twenty-First Century / R. Peters. – Cambridge : Cambridge University Press, 2005. – 222 p.

**(Дата подачи: 19.02.2019 г.)**

*Д. У. Філічык*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*D. Philipchik*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 24.00.03**

# ВЫВУЧЭННЕ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ МУЗЕЯМІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЯК СРОДАК ЯЕ ЗАХАВАННЯ (1991–2016 гг.)

# RESEARCH OF INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE IN THE BELARUSIAN MUSEUMS AS A TOOL OF ITS PRESERVATION (1991–2016)

*У артыкуле разгледжана навукова-даследчая дзейнасць беларускіх музеяў у сферы нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Прыведзены прыклады музейных даследаванняў, якія спрыялі захаванню нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Паказаны магчымасці выкарыстання музейных даследаванняў для павышэнне асвядомленасці аб нематэрыяльнай спадчыне, для забеспячэння непарыўнасці перадачы такой спадчыны.*

*Ключавыя словы: нематэрыяльная культурная спадчына; навукова-даследчая дзейнасць музея; музеі Рэспублікі Беларусь; захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны.*

*The article describes the research activities of the Belarusian museums in the field of intangible cultural heritage. Examples of museum studies, which contributed to the safeguarding of intangible cultural heritage are presented. The possibilities of use of museum studies for improving awareness of intangible heritage, to ensure the continuity of the transmission of such heritage, are given.*

*Key words: intangible cultural heritage; research activities of museums; Museum of the Republic of Belarus; safeguarding of intangible cultural heritage.*

Захаванне гісторыка-культурнай спадчынай з'яўляецца прыярытэтнай задачай для кожнага грамадства і ўсяго чалавецтва. Калі ў справе захавання матэрыяльнай спадчыны міжнародная супольнасць значна прасунулася наперад, то ў зберажэнні нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей НКС), у пэўнай ступені, робіць першыя крокі. Цікавасць даследчыкаў да праблемы захавання НКС значна актывізавалася пасля прыняцця ў 2003 г. Канвенцыі ЮНЕСКА «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны» (далей Канвенцыя 2003 г.) [1]. Паводле Канвенцыі 2003 г. да НКС адносяцца «звычаі, формы прадстаўлення і ўяўлення, веды і навыкі, а таксама

звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, якія прызнаюцца супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны» [1]. У справу захавання НКС у Рэспубліцы Беларусь уключыліся розныя ўстановы, у тым ліку і музеі. Музеі ў сваёй дзейнасці выкарыстоўвалі нематэрыяльныя праяўленні культуры і да прыняцця Канвенцыі 2003 г., а пасля яе ўступлення ў сілу на тэрыторыі нашай краіны ў 2006 г., пачалі ўдзяляць НКС асаблівую ўвагу. У адрозненні ад іншых устаноў культуры, музей валодае значным навукова-даследчым патэнцыялам, які можа быць скіраваны на вывучэнне НКС. Таму ніжэй разгледзім прыклады навукова-даследчай дзейнасці музеяў у сферы нематэрыяльнай спадчыны, якія не толькі ўзбагачалі навуковыя веды аб гэтай з’яве культуры, але і спрыялі яе захаванню.

Паводле Канвенцыі 2003 г. тэрмін «захаванне» азначае «прыняцце мер з мэтай забеспячэння жыццяздольнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны, уключае яе ідэнтыфікацыю, дакументаванне, даследаванне, абарону, папулярызацыю, павышэнне яе ролі, перадачу, галоўным чынам з дапамогай фармальнай і нефармальнай адукацыі, а таксама рэвіталізацыю розных аспектаў такой спадчыны» [1]. Відавочна, што даследаванне НКС можа разглядацца ў якасці адной з мер (але не адзінай), накіраваных на захаванне НКС. Матэрыялы па імплементацыі Канвенцыі 2003 г. удакладняюць, што даследаванне НКС можа разглядацца як мера па захаванні гэтай спадчыны, калі яно адпавядае дзвюм умовам: 1. Даследаванне накіравана на садзеянне непарыўнай практыцы і перадачы НКС; 2. Даследаванне падрыхтавана пры ўдзеле і са згоды адпаведных супольнасцей [2, с. 117]. Не ўсе музейныя даследаванні НКС адпавядалі вышэй прыведзеным крытэрыям, таму што музейнае вывучэнне мае сваю спецыфіку. Спецыфіка музеялагічных даследаванняў нематэрыяльнай спадчыны заключаецца ў асаблівым акцэнце на артэфакты, звязаныя з гэтай спадчынай, на матэрыяльнае ўвасабленне НКС. Навукова-даследчая работа ў музеі складаецца з профільных і музеялагічных даследаванняў. Калі размова ідзе аб вывучэнні НКС у межах профільных даследаванняў музея, то ў дадзеным выпадку гэта будуць этналагічныя даследаванні. Гэта дазволіць музейным спецыялістам надаць асаблівую ўвагу непасрэдна НКС.

Калі ж казаць аб вывучэнні нематэрыяльнай спадчыны ў межах музеялагічных даследаванняў, то тут магчыма вылучыць некалькі накірункаў. Найперш, гэта даследаванне музейных прадметаў і калекцый, звязаных з НКС. Хаця самі прадметы не з’яўляюцца нематэрыяльнай спадчынай, але без іх вывучэння, сістэматызацыі, захавання немагчыма навукова абгрунтаванае прадстаўленне элементаў НКС у экспазіцыі, распрацоўка музейна-педагагічных праграм, падрыхтоўка выставак і іншыя віды работ, скіраваныя на павышэнне асвядомленасці аб НКС. Напрамую ці ўскосна музеі займаюцца вывучэннем НКС пры распрацоўцы навуковай канцэпцыі музея, даследаваннях у галіне  камплектавання фондаў, падчас навуковага

праектавання экспазіцый і выстаў, пры правядзенні даследаванняў у галіне музейнай камунікацыі.

У разглядаемы перыяд музеі Рэспублікі Беларусь паказалі прыклады таго, што праз вывучэнне НКС магчыма не толькі зафіксаваць і даследаваць гэту спадчыну, але і спрыяць яе захаванню. Асаблівым чынам вылучалася навукова-даследчая работа супрацоўнікаў Мотальскага музея народнай творчасці. У выніку даследчай дзейнасці калектыву музейных спецыялістаў пад кіраўніцтвам дырэктара В. Р. Кульбеды былі падрыхтаваны і прадстаўлены матэрыялы дасье на ўнясенне ў Дзяржаўны спіс элемента НКС «Вясельная каравайная традыцыя вескі Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці» [3, л. 4]. Увыніку дадзены элемент быў уключаны ў Дзяржаўны спіс у 2016 г. [4]. Прыклад Мотальскага музея народнай творчасці паказаў, што ўзровень навукова-даследчай работы і кваліфікацыя музейных спецыялістыў дазваляюць ім удзельнічаць у стварэнні і вядзенні інвентара НКС.

Хаця беларускія музеі павольна ўключаліся ў інвентарызацыю НКС, яны, тым не менш, актыўна яе вывучалі і публікавалі вынікі даследаванняў. Актыўнай даследчай і выдавецкай дзейнасцю вылучаўся Веткаўскі музей стараабраднікцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава (далей. *ВМСБТ*). Навуковыя і навукова-папулярныя артыкулы супрацоўнікаў музея неаднаразова з'яўляліся на старонках газеты «Голас Веткаўшчыны» і «Гомельская праўда». У 1998 г. падрыхтаваныя супрацоўнікамі музея артыкулы «Веткаўскае шытво бісерам», «Ручнікі Веткаўшчыны», «Вераванне і абрады Веткаўшчыны», «Ручнік у абрадах», «Веткаўская дамавая разьба» і шэраг іншых увайшлі ў кнігу «Памяць. Веткаўскі раён» [5, с. 420]. У публікацыях былі прадстаўлены вынікі музейных даследаванняў, змешчаны прыклады фальклорных тэкстаў. Адметнасць публікацый у гэтых выданнях заключаецца ў іх даступнасці менавіта лакальнай супольнасці. Гэта спрыяла не толькі ўвядзенню ў навуковы зварот новых ведаў, але і папулярызацыі элементаў НКС сярод носьбітаў, росту павагі да гэтай спадчыны.

У XXI ст. музей выйшаў на новы ўзровень навукова-даследчай працы і пачаў рэалізоўваць буйныя навукова-даследчыя праекты. Так, у 2001 г. выйшаў навукова-метадычны зборнік «Веткаўскі музей народнай творчасці». У зборніку былі прадстаўлены вынікі экспедыцыйнай дзейнасці музея, а таксама навуковых даследаванняў у розных накірунках. Гэта этнаграфічныя даследаванні, даследаванні ў галіне семіётыкі традыцыйнай культуры, вывучэнне калекцый, вывучэнне НКС рэгёна. Напрыклад, у артыкуле І. Ю. Смірновай зроблены агляд асноўных калекцый музея, гісторыя камплектавання фондаў, адзначана наяўнасць фонду відэа- і фотаматэрыялаў [6, с. 12]. У навукова-даследчай рабоце Веткаўскага музея выразна прасочваліся два прыярытэтныя накірункі: семіётыка традыцыйнай культуры (Г. Р. Нячаева, Г. І. Лапацін, І. Ю. Смірнова) і музейна-

педагагічная праблематыка (Г. Р. Нячаева, Г. І. Лапацін, С. І. Леонцьеў, Л. М. Мазейка).

У 2004 г. выйшаў прымеркаваны да 25-пяцігоддзя музея зборнік навуковых артыкулаў пад назвай «Навуковыя запіскі Веткаўскага музея народнай творчасці». Супрацоўнікамі музея быў прадстаўлены вопыт вывучэння калекцый, экспедыцыйнай, музейна-педагагічнай і экспазіцыйна-выставачнай работы. Значная частка артыкулаў адлюстроўвала даследаванні арнамента, яго семантыкі, мясцовых асаблівасцяў, мясцовых назваў пэўных арнаментальных элементаў і г. д. (Г. Р. Нячаевай, С. Ю. Лявонцьева, Л. А. Новікава, Л. Д. Раманава). Вылучаецца артыкул Т. А. Ананьева і Т. В. Шэвеленка, дзе аўтары падзяліліся з калегамі вопытам работы гуртка па традыцыйным ткацтве, што дзейнічаў пры музеі [7, с. 279]. У дадзеным выпадку бачна, што музейныя спецыялісты імкнуліся даследаваць не толькі калекцыі, звязаныя з НКС, але і практыкі перадачы гэтай спадчыны.

У 2005–2006 гг. музей працаваў над уласным навукова-даследчым праектам «Галасы адышоўшых вёсак». Была праведзена вялікая праца па сістэматызацыі дадзеных аб культуры, традыцыі, гісторыі вёсак, адселеных у выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Супрацоўнікі музея сфарміравалі БД, куды ўвайшло 316 экспанатаў, а таксама больш за 500 фальклорных тэкстаў, запісаных супрацоўнікамі музея ў розныя гады. Вынікам рэалізацыі праекта даследаванняў супрацоўнікаў Веткаўскага музея стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава стала кніга «Голоса ушедших деревень», якая выйшла ў свет у 2008 г. [8] Шэсць раздзелаў выдання ахопліваюць розныя аспекты культурнага жыцця рэгіёну: кніжная спадчына, іканапіс стараабрадніцкіх слабод, беларуская народная ікона, узорнае ткацтва (строі і ручнікі), разьба па дрэве (упрыгожванне пабудоў), фальклор, абрады, міфалогія. У кнізе прыведзены фота носьбітаў НКС, шматлікія фальклорныя запісы, багаты ілюстратыўны матэрыял. Дадзеная публікацыя спрыяла павышэнню асвядомленасці аб НКС і яе носьбітаў.

Некаторыя музеі ператвараліся ў пляцоўкі для навуковага абмеркавання праблем, звязаных з НКС. Так пры ўдзеле Музея беларускага Палесся былі апублікаваны матэрыялы міжнароднага навуковага круглага стала пад назвай «Асоба збіральніка ў захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны» (2015 г.). У шэрагу артыкулаў аўтары намагаюцца вызначыць ролю збіральніка, навучальнай установы ці грамадзянскай супольнасці ў працэсах дакументавання НКС. Доктар філалагічных навук, прафесар В. С. Новак у сваім артыкуле адзначыла важнасць работ па дакументаванні НКС Гомельскага рэгіёна, так як яны «пашыраюць і ўзбагачаюць уяўленні аб стане і дынаміцы бытавання фальклорных жанраў, іх захаванні ў мясцовых і рэгіянальных традыцыях» [9, с. 32].

Частка музеяў сталі рэгіянальнымі цэнтрамі вывучэння НКС праз арганізацыю перыядычных навукова-даследчых канферэнцый. Напрыклад сістэматычная праца па вывучэнні НКС вялася ў Лепельскім гісторыка-

краязнаўчым музеі. На базе музея перыядычна, з 2004 г. праводзіліся навукова-практычныя канферэнцыі пад назвай «Лепельскія чытанні». За разглядаемы перыяд выйшла шэсць зборнікаў матэрыялаў канферэнцый. У зборніку за 2004 г. быў змешчаны артыкул доктара гістарычных навук У. А. Лобача. Аўтар даследаваў месца элементаў культурнай прасторы ў сістэме народнай медыцыны Лепельшчыны, а таксама аб'екты сакральнай геаграфіі ў народнай медыцыне Лепельшчыны [10, с. 22].

«Лепельскія чытанні» за 2006 г. змяшчалі артыкулы, падрыхтаваныя на падставе этнаграфічных матэрыялаў, сабраных на Лепельшчыне. Гэта даследаванне фалькларыста Т. В. Валодзінай «Капрызы ў сістэме дзіцячых хваробаў» [11, с. 29] і У. А. Лобача «Сімволіка дарогі ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў (паводле этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў Лепельшчыны)» [12, с. 31].

Удзельнікі навукова-практычных канферэнцый у наступныя гады (2008, 2010, 2012, 2014 гг.) не абыходзілі ўвагай вывучэнне НКС Лепельшчыны. Даследавалася народная медыцына, міфалагічныя ўяўленні аб прасторы ў вясельных песнях Беларусаў Лепельшчыны, лес у традыцыйнай карціне свету беларусаў, абрад «Дзяды» і інш. [13, 14]. У зборніку за 2014 г. змешчана пяць артыкулаў, прысвечаных традыцыйнай культуры і нематэрыяльнай спадчыне (аўтары – У. А. Лобач, У. Я. Аўсейчык, П. І. Мішын, В. І. Мішына, В. У. Тухта) [15].

Прыклад навукова-даследчай работы Лепельскага гісторыка-краязнаўчага музея паказаў, што арганізацыя музейных канферэнцый стымулявала цікавасць да лакальнай гісторыі і нематэрыяльнай спадчыны не толькі музейных спецыялістаў, але і іншых даследчыкаў (фалькларыстаў, этнографаў, гісторыкаў). Карыстаючыся адпаведнай метадалогіяй і маючы адпаведную кваліфікацыю аўтары даследавалі на больш глыбокім узроўні розныя аспекты НКС.

Важную ролю ў музейных даследаваннях НКС адыгрывала і асоба даследчыка. Так некалькі кніг з'явілася ў выніку даследчай дзейнасці дырэктара Гудзевіцкага дзяржаўнага гісторыка-літаратурнага музея А. М. Белакоза. У выглядзе ўспамінаў, інтэрв'ю і асобных артыкулаў з'явілася кніга «Каб жыла Беларусь». Аўтар прывёў уласны вопыт па абуджэнні цікавасці ў навучэнцаў да традыцыйных рамёстваў і промыслаў, паказаў шлях музейнага адраджэння тэхналогіі падвойнага ткацтва ў Гудзевічах [16, с. 9]. У 2012 г. выйшла яшчэ адна кніга А. М. Белакоза пад назвай «Музей у Гудзевічах», у якой ён асвятліў гісторыю стварэння музея, камплектавання фондаў, пабудавання частак экспазіцыі, звязаных з НКС, рэалізацыі культурна-адукацыйных мерапрыемстваў [17, с. 55].

Не абыходзілі бокам вывучэнне НКС і музеі-запаведнікі. У гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе» (далей ГКМЗ) таксама звярталіся да праблем захавання нематэрыяльнай спадчыны. У 1997 г. убачылі свет матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя і культура

Заслаўя ў святле агульнанацыянальных праблем», якая была арганізавана музеем-запаведнікам у 1995 г. У артыкуле А. М. Калбаскі было выкладзена аўтарскае разуменне місіі музея-запаведніка ў грамадстве. А. М. Калбаска абгрунтаваў неабходнасць пераўтварэння музея-запаведніка ў экамузей шляхам вяртання ў жывое асяроддзе згубленых з'яў і элементаў культуры, у тым ліку і тых, якія можна аднесці да нематэрыяльнай спадчыны [18, с. 10]. У адным з артыкулаў супрацоўніца музея-запаведніка М. І. Касцюкевіч даследавала гісторыю кавальскага рамяства, прадставіла вопыт музеефікацыі жывой традыцыі праз стварэнне музейных майстэрань. Аўтар прыйшоў да высновы, што стварэнне і развіццё рамесніцкіх цэнтраў пры музеях паспрыяе захаванню самабытнасці культуры [19, с. 116].

У даследуемы перыяд музейныя ўстановы Беларусі актыўна і паслядоўна займаліся вывучэннем НКС. Прасочваецца тэндэнцыя да эвалюцыі тэм даследаванняў ад вывучэння калекцый, іх сістэматызацыі да праблем выкарыстання НКС у культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў, прадстаўлення элементаў нематэрыяльнай спадчыны ў экспазіцыйна-выставачнай прасторы. Паступова з'явіліся публікацыі аб НКС, скіраваныя на лепшае яе разуменне, вывучэнне практык і метадаў перадачы гэтай спадчыны, спосабаў актуалізацыі і падтрымання жыццяздольнасці НКС. Прыклад Мотальскага музея народнай творчасці паказаў магчымасць удзелу музейных спецыялістаў у працэс інвентарызацыі НКС.

Публікацыя музейнымі супрацоўнікамі артыкулаў аб нематэрыяльнай спадчыне ў кнігах серыі «Памяць», а таксама ў мясцовым, абласным і рэспубліканскім перыядычным друку спрыяў павышэнню асвядомленасці аб НКС у грамадстве, усведамленню значнасці гэтай спадчыны, асабліва сярод яе носьбітаў.

У музейных даследаваннях НКС найбольшая ўвага надавалася вывучэнню традыцыйных рамёстваў і цырымоній. У меншай ступені знайшлі адлюстраванне ў навуковых працах даследаванні вусных традыцый і формаў выражэння, выканальніцкіх мастацтваў, светапогляду людзей, міфалогіі, традыцыйнай ежы. Такое становішча абумоўлена выкарыстаннем падчас правядзення даследаванняў класічнай музейнай парадыгмы, якая галоўную ўвагу пераносіла на вывучэнне калекцый, а праблемы інтэрпрэтацыі нематэрыяльнай спадчыны адсоўвала на другі план.

Частка музеяў у разглядаемы перыяд з'яўлялася навуковымі рэгіянальнымі цэнтрамі па вывучэнні нематэрыяльнай спадчыны і традыцыйнай культуры. Аб гэтым сведчаць шматлікія музейныя выданні, падрыхтаваныя і апублікаваныя метадычныя матэрыялы (апытальнікі для збору НКС, музейна-педагагічныя праграмы), перыядычныя навукова-практычныя канферэнцыі, якія праходзілі на базе дадзеных устаноў. Музейныя навукова-практычныя канферэнцыі прыцягвалі ўвагу да НКС не толькі музейных супрацоўнікаў, але акадэмічных спецыялістаў, што спрыяла ўсебаковаму, комплекснаму вывучэнню нематэрыяльнай спадчыны.

Усё вышэй пералічанае дазваляе сцвярджаць, што музейныя даследаванні НКС у Рэспубліцы Беларусь спрыялі як паглыбленню навуковых ведаў аб гэтай з'яве культуры, так і з'яўляліся адным з найважнейшых шляхоў яе захавання.


**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Text of the Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage // Official website of The United Nations Educational, Scientific and Cultural Organization [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.unesco.org/culture/ich/index.php?lg=en&pg=00006. – Date of access: 10.01.2019.

2. Имплементация Конвенции ЮНЕСКО об охране нематериального культурного наследия на национальном уровне / Институт искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы НАН Беларуси. – Минск: Право и экономика, 2012. – 194 с.

3. Матэрыялы дасье на ўключэнне вясельнай каравайнай традыцыи вёскі Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей // Архіў бягучага справаводства Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – 31 л.

4. Вясельная каравайная традыцыя вёскі Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці / Сайт «Жывая спадчына Беларусі» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://livingheritage.by/nks/3353/. – Дата доступа: 13.06.2018.

5. Памяць: Ветк. р-н: Гіст.-дакум. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі: у 2 кн. / уклад. У. Я. Райскі. – Кн. 2. – 461 с.

6. *Смірнова, І. Ю.* Дом, які мы будуем / І. Ю. Смірнова // Веткаўскі музей народнай творчасці: навук.-метад. зб. / Бел. ін-т праблем культуры. – Мінск: БелІПК, 2001. – С. 9–12.

7. *Ананьева, Т. А.* Восстановление традиционных технологий. Рушник из Волпы (из опыта работы кружка традиционного ткачества) / Т. А. Ананьева, Т. В. Шевеленко // Навуковыя запіскі Веткаўскага музея народнай творчасці: археалогія, гісторыя, культура кн., этнаграфія, фальклор, музеязнаўства: да 25-годдзя заснавання Ветк. музея нар. творчасці / уклад. Г. І. Лапацін. – Гомель: Гомел. дзярж. ун-т, 2004. – С. 279–280.

8. Голоса ушедших деревень / Г. Г. Нечаева [и др.]; под общ. ред. Г. Г. Нечаевой. – Минск: Беларус. наука, 2008. – 342 с.

9. *Новак, В.* Фальклорна-этнаграфічная спадчына Гомельшчыны: з вопыту сучасных палявых даследаванняў духоўнай культуры рэгіёна / В. Новак // Асоба збіральніка ў захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны: да 200-годдзя з дня нараджэння Оскара Кольберга: матэрыялы Міжнар. навук. круглага стала (25–26 чэрв. 2014 г., Мінск, Пінск) / уклад.: Д. Алексенка, Ю. Пацюпа. – Мінск, 2015. – С. 29–32.

10. *Лобач, У. А.* Элементы культурнай прасторы ў сістэме народнай медыцыны Лепельшчыны / У. А. Лобач // Лепельскія чытанні: (навук.-практыч. канф., прысвеч. 565-годдзю г. Лепеля) 27 кастр. 2004 г. / склад. А. У. Стэльмах. – 2005. – С. 18–22.

11. *Валодзіна, Т. В.* Капрызы ў сістэме дзіцячых хваробаў (па матэрыялах з Лепельшчыны) / Т. В. Валодзіна // Лепельскія чытанні: Другая навук.-практыч. канф.: зб. дакладаў склад. А. У. Стэльмах. – 2006. – С. 29–31.

12. *Лобач, У. А.* Сімволіка дарогі ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў (паводле этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў Лепельшчыны) / У. А. Лобач // Лепельскія чытанні: Другая навук.-практыч. канф.: зб. дакладаў / склад. А. У. Стэльмах. – 2006. – С. 31–33.

13. *Мишин, П. И.* Образ волка в народном снотолковании Лепельщины / П. И. Мишин // Лепельскія чытанні: матэрыялы IV навук.-практ. канф. (Лепель, 17–18 вер. 2010 г.) / рэдкал.: Я. А. Грэбень, А. У. Стэльмах. – Мінск: Медысонт, 2011. – С. 171–175.

14. *Мишин, П. И.* Концепт пересечения дороги в традиционной картине мира белорусов: на примере одной магической практики (по материалам Лепельского района) / П. И. Мишин // III Лепельскія чытанні: матэрыялы навук.-практ. канф., 10 кастр. 2008 г. – Лепель: Лепельскі раённы краязнаўчы музей, 2008. – С. 128–131.

15. Лепельскія чытанні: матэрыялы VI навук.-практ. канф. (Лепель, 17–18 каст. 2014 г.) / рэдкал.: Я. А. Грэбень, А. У. Стэльмах. – Мінск: Медысонт, 2014. – 247 с.

16. Каб жыла Беларусь: арт., успаміны, інтэрв'ю / А. Белакоз. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2003. – 103 с.

17. *Белакоз, А.* Музей у Гудзевічах / А. Белакоз. – 2012. – Кн. 1.– 199 с.

18. *Калбаска, А.* З вопыту стварэння гісторыка-культурнага запаведніка ў Заслаўі (май 1988 – кастр. 1994 г.) / А. Калбаска // Заслаўскія чытанні 1995 г.: матэрыялы міжнар. канф. «Гісторыя і культура Заслаўя ў святле агульнанацыянальных праблем», Заслаўе, 9–11 лістап. 1995 г. / уклад., навук. рэд.: Т. С. Скрыпчанка. – Заслаўе, 1997. – С. 9–12.

19. *Касцюкевіч, М. І.* Старажытнае рамяство ў старажытным горадзе / М. І. Касцюкевіч // Заслаўскія чытанні 1995 г.: матэрыялы міжнар. канф. «Гісторыя і культура Заслаўя ў святле агульнанацыянальных праблем», Заслаўе, 9–11 лістап. 1995 г. / уклад., навук. рэд.: Т. С. Скрыпчанка. – Заслаўе, 1997. – С. 116–119.

**(Дата падачы: 28.02.2019 г.)**

*С. А. Шыдлоўскі*
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Наваполацк

*S. A. Shydlouski*
Polotsk State University, Novopolotsk

**УДК 392.3(476)«18»**

# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПАДСТАВЫ ВЫХАВАННЯ Ў ДВАРАНСКІХ ПАМЕШЧЫЦКІХ СЕМ'ЯХ БЕЛАРУСІ (канец XVIII – пачатак XX ст.)

# THEORETICAL FOUNDATIONS OF EDUCATION IN NOBLE LANDLORD FAMILIES OF BELARUS (LATE XVIII – EARLY XX CENTURIES)

*У дадзеным артыкуле аналізуюцца тэарэтычныя падставы выхавання ў дваранскіх памешчыцкіх сем'ях Беларусі. Даследуюцца крыніцы ідэйных уплываў і мастацкія ўзоры для пераймання. Дваранскі маёнтак разглядаецца як адукацыйнае асяроддзе, якое з'яўлялася важным фактарам у практыках выхавання і хатняга навучанне дзяцей у памешчыцкіх сем'ях Беларусі канец XVIII – пачатак XX стст.*

*Ключавыя словы: ідэалы, мэты і метады выхавання, традыцыі выхавання, беларускае дваранства, памешчыцкая сям'я*

*In this article the noble estate of Belarus of the end of XVIII-the beginning of XX centuries is considered as the educational environment which was an important factor in practices of education and home training of children in landowner families. Theoretical foundations of education in noble landowner families of Belarus are analyzed. Sources of ideological influences and role models are given.*

*Key words: ideals, objectives and methods of education, traditions of education, the Belarusian nobility, landowner family*